Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

Факультет начального образования

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

*Материалы II Международной студенческой научно-практической конференции*

*(в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего»)*

*г. Минск, 19 апреля 2018 г.*

*Научное электронное издание локального распространения*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
БГПУ
2018

ISBN 978-985-541-517-7

© Оформление. БГПУ, 2018

УДК 373.3
ББК 74.24
С568

Редакционная коллегия:
*Жданович Н. В.* (отв. ред.), кандидат филологических наук, доцент, декан факультета начального образования БГПУ;
*Азарко О. В.*, кандидат филологических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по учебной работе;
*Сорока О. Г.*, кандидат педагогических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по научной работе;
*Василевская Е. С.,* кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Качан О. Г.*, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Баранова Л. И.*, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики и психологии начального образования БГПУ

**Современные** тенденции развития начального образования: материалы II Междунар. студ. науч.-теор. конф., г. Минск, 18 апреля
С568 2018 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: Н. В. Жданович (отв. ред.) [и др.]. — Минск : БГПУ, 2018. — 224 с.

ISBN 978-985-541-515-7.

В сборнике представлены результаты исследований студентов, отражающие актуальные вопросы педагогики и психологии начального образования, методик преподавания учебных предметов в начальной школе.

Адресуется преподавателям, аспирантам, студентам и всем, кто интересуется проблемами педагогики, психологии младшего школьного возраста и методик преподавания в начальной школе.

*Минимальные системные требования:*
Операционная система Windows 98 и выше
Процессор Pentium III, RAM 32 Mb (ОЗУ), HDD 250 Mb
Видеоадаптер с разрешением 800×600, 256-цветов,
32 Mb видеопамяти, DVD-ROM, мышь

© Оформление. БГПУ, 2018

*Программное обеспечение:* Adobe Acrobat Reader

Ответственный за выпуск *О. Г. Сорока*
Техническое редактирование и компьютерная верстка *А. А. Покало*
Дизайн обложки *Е. С. Выдрицкой*

Дата подписания к использованию 03.10.18. 2,06 Mb. Тираж 5 электрон. экз. Заказ 621.

*Издатель и полиграфическое исполнение:* учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».

Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13. Ул. Советская, 18, 220030, Минск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

# ANALYSIS OF ARTISTIC TEXT IN LESSONS OF LITERARY READING IN PRIMARY SCHOOL

*Ю.Ю. Бейнаровіч*

*Y. Beinarovich*

БДПУ (Мінск)

Нав. кір. – В.Г. Качан, канд. филал. навук, дацэнт

У артыкуле разглядаецца значэнне аналізу мастацкага твора для развіцця маўлення малодшых школьнікаў, апісваецца методыка працы з мастацкім тэкстам на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе.

Ключавыя словы: мастацкі твор, аналіз твора, пачатковыя класы.

The article considers the importance of the analysis of a work of art for the development of speech of junior schoolchildren, describes the methodology for working with an artistic text in literary reading classes in an elementary school *(Google Переводчик).*

Key words: artistic work, analysis of a work, initial classes.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікае значэнне маюць кнігі і чытання ў жыцці чалавека. Кніга з’яўляецца крыніцай ведаў, сродкам захавання і перадачы ад пакалення да пакалення ўсіх дасягненняў навукі і культуры. Кніга не толькі дае веды, але і дапамагае выхоўваць усебакова развітую асобу. Яна з’яўляецца крыніцай духоўнага ўзбагачэння дзіцяці.

Пытаннямі чытання і аналізу мастацкіх тэкстаў займаліся метадысты М. Р. Львоў, Г. І. Верашчака, Г. А. Бакуліна, Т. А. Ладыжанская і др. Увагу менавіта аналізу мастацкага твора надавалі ў сваіх працах Ф. І. Буслаеў, В. В. Галубкова, М. М. Скаткіна, І. Я. Лернер, А. М. Пакроўскі і іншыя.

Праблемы літаратурнага навучання вучняў не губляюць сваёй актуальнасці. Дзеці неахвотна хочуць вывучаць літаратурнае чытанне ў школе. Гэта залежыць ад неразумення беларускай мовы, ад недастаткова добрай падрыхтаванасці да ўрока настаўніка, ад працы на ўроку як настаўніка, так і вучняў і г. д. Галоўным на ўроку літаратурнага чытання пры вывучэнні твораў з’яўляецца правядзенне аналізу мастацкага тэксту. Аналіз дапамагае вучням больш поўна зразумець мастацкі твор.

Вялікую ролю ў вывучэнні мастацкіх твораў адыгрывае аналіз мастацкіх твораў. «Аналіз – гэта метад навуковага дасягнення, пры якім прадмет вывучэння раскладаецца на састаўныя часткі ці ўяўна расчляняецца шляхам лагічнай

абстракцыі» [2, с. 146]. На ўроках літаратурнага чытання аб'ектам вывучэння з'яўляецца мастацкі твор, таму пры аналізе трэба ўлічваць яго спецыфіку. Аналіз мастацкага тэксту павінен адбывацца па лагічна завершаных частках. «Прааналізаваць твор – гэта значыць знайсці той узровень зносін з мастацтвам, калі адбываецца пераход ад успрымання мастацкіх вобразаў да сістэмы паняційных і мастацкіх абагульненняў» [2, с. 146]. Існуюць меркаванні, што аналізаваць твор не трэба, бо аналіз парушае цэласнасць твора. Аналіз на ўроку мае вялікую ролю, таму што падчас аналізу адбываецца разуменне твора, ён фарміруе ўменне самастойна асэнсоўваць твор, а таксама фарміруе ўменне аналізаваць тэкст.

Адной з галоўных задач адукацыі малодшых школьнікаў з'яўляецца развіццё маўлення. Праца над комплексным аналізам твора дапамагае зразумець, асэнсаваць, узнаўляць мастацкі тэкст. Тэкст таксама пашырае чытацкі кругагляд, пашырае эрудыцыю.

На ўроках літратаурнага чытання вельмі важна метадычна правільна арганізаваць працу над мастацкім творам, каб дзеці маглі найбольш поўна асэнсаваць ідэю твора, усвядоміць асноўную думку, зразумець праблему твора.

Мастацкія творы ў пачатковых класах вывучаюцца на вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне». Літаратурнае чытанне вывучаецца ў пачатковай школе з 2 класа па 4 клас. Асноўнай мэтай з'яўляецца фарміраванне малодшага школьніка як актыўнага свядомага чытача, які валодае пэўнымі навыкамі і ўменнямі працы з творам, з кнігай, даведачнай і вучэбнай літаратурай.

Асноўнае месца ў кнігах па літаратурным чытанні займае мастацкі матэрыял. Мастацкі твор уяўляе сабой складанае цэлае. Кожны вучань успрымае мастацкі твор па-своему, таму што ўспрыманне твора залежыць ад узроставых асаблівасцей, жыццёвага вопыту, ад узроўню чытацкай падрыхтоўкі. Чытанне мастацкіх твораў выклікае ў вучняў глыбокія пачуцці перажыванні, думкі.

У мастацкім творы жыццё прадстаўлена ў вобразах. Вобразная форма адлюстравання рэчаіснасці з'яўляецца істотным адрозненнем мастацкага твора ад навуковага. Для вобразнага адлюстравання характэрны абагульненасць і індывідуалізаванасць.

«У літаратурным творы, нароўні з аб'ектыўным зместам, мае месца заўсёды і суб'ектыўная адзнака аўтарам падзей, фактаў, чалавечых адносін і г.д. Гэтая суб'ектыўная адзнака таксама перадаецца праз вобраз. Сам адбор жыццёвых сітуацый, у якіх аказваецца дзеючая асоба, яго ўчынкі, адносіны з навакольнымі людзьмі і прыродай нясуць на сабе аўтарскую ацэнку» [3, с. 124].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для таго каб вучні маглі разумець мастацкі твор, трэба праводзіць працу па ўспрыманню мастацкага твора. На ўроку трэба праводзіць падрыхтоўку да ўспрымання тэксту, даведацца аб агульным эмацыянальным успрыманні мастацкага твора вучнямі, у канцы абавязкова трэба асэнсоўваць агульнае ўспрыманне тэксту і выказваць свае думкі па творы. Па меркаваннях псіхолагаў, вучні пачатковых класаў праяўляюць два тыпы адносін да мастацкага свету твораў. Першы тып адносін – эмацыянальна-вобразны – гэта непасрэдная эмацыянальная рэакцыя дзіцяці на вобразы, якія знаходзяцца ў цэнтры твора. Другі – эмацыянальна-ацэначны – залежыць ад жыццёвага і чытацкага вопыту дзіцяці, дзе прысутнічаюць элементы аналізу.

Для паўнацэннага ўспрымання твора трэба, каб настрой вучняў адпавядаў танальнасці твора. Дапамагчы стварыць адпаведны мастацкаму твору настрой і зацікавіць вучняў можна пры дапамозе твораў іншых відаў мастацтва, якія можна выкарыстаць на занятках. Гэта могуць быць музычныя творы, якія дапамагаюць уздзейнічаць на пачуцці, творы жывапісу, якія дапамагаюць зрокава ўявіць адпаведныя абставіны.

На ўроках літаратурнага чытання вучні атрымліваюць уяўленні пра вобразныя сродкі мовы мастацкіх твораў. Праца са зместам твора развівае мысленне і маўленне школьнікаў, выхоўваае любоў да роднай мовы, культуры, знаёміць з асноўнымі паняццямі літаратуры («дзеючая асоба», «кампазіцыя твора»), з літаратурнымі жанрамі (апавяданне, верш, байка, казка).

У размове з вучнямі пра твор трэба ўжываць літаратуразнаўчыя тэрміны, такім чынам вучні папаўняюць свой слоўнікавы запас спецыяльнай лексікай. Аналіз мастацкага твора прадугледжвае развіццё чытацкіх якасцяў вучня. Калі на занятках аналіз праведзены метадычна граматна, ён уплывае на развіццё эмацыянальнай сферы вучня і яго вобразнага ўяўлення, на фарміраванне ў яго эстэтычнай ацэнкі.

Аналіз твора вызначаецца выхаваўчай накіраванасцю, таму што мастацкія творы не толькі ўзбагачаюць ведамі, але і садзейнічаюць выхаванню высокіх ідэалаў. Пры аналізе мастацкага твора трэба ўлічваць узроставыя асаблівасці вучняў. Любы твор шматтэмны і шматпраблемны, і таму пры аналізе трэба выбіраць тую тэму, якая найбольш актуальная для вучняў пэўнага ўзросту. Але трэба ўлічваць, што ў рамках аднаго ўзросту ёсць вучні з рознай ступенню агульнай падрыхтоўкі, з розным літаратурным развіццём, рознай эмацыянальнай уражлівасцю. Таму настаўніку трэба дыферэнцыравана падыходзіць да аналізу твора.

Пры аналізе мастацкіх твораў галоўную ролю іграе чытанне, бо без правільнага чытання не будзе разумення тэксту. Чытанне – гэта падмурак для далейшай працы над тэкстам. «Поспех вывучэння твора ў многім залежыць ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арганізацыі першага чытання. Першае чытанне звычайна мае эмацыянальную афарбоўку, яно павінна стварыць адпаведны настрой, зацікавіць вучняў, выклікаць ў іх эстэтычнае перажыванне і асалоду» [1, с. 110]. Першае чытанне ў 2 – 3 класе павінен праводзіць настаўнік, а ў 3 – 4 класе можа праводзіць як настаўнік, так і добра чытаючы вучань, і чытанне павінна быць уголас, правільным і выразным.

На ўроках чытання пры правільнай арганізацыі цэлай сістэмы заняткаў, звязаных з чытаннем, развіваецца мысліцельная дзейнасць і маўленне вучняў, ажыццяўляецца выхаванне асобы, выпрацоўваюцца ўменні і навыкі чытання, работы з тэкстам. Гэта ўсё складаецца з заняткаў: «чытанне ў розных яго відах і формах, затым гутарка, расказ, паведамленне настаўніка, якія рыхтуюць школьнікаў да ўспрымання і разумення прачытанага, гутарка ў працэсе чытання і пасля яго дапамагаюць лепш разабрацца ў змесце твора, усвядоміць змест канкрэтных фактаў, матывы паводзінаў герояў, іх думкі, пачуцці, настрой; слоўнікавая работа, якая забяспечвае свядомае ўспрыманне твора і правільнае яго прачытанне; практыкаванні ў складанні плана прачытанага; розныя віды пераказаў і іншыя творчыя работы» [4, с. 133].

Вельмі важна праводзіць працу над мастацкім тэкстам правільна, свядома і разнастайна, каб вучням было цікава вывучаць літаратуру. Кожны ўрок пры правільнай яго арганізацыі павінен развіваць мысліцельную здольнасць, пашыраць узровень ведаў, удасканальваць навыкі, выхоўваць творчую асобу.

### *Літаратура*


1. Гоўзіч, І. М. Методыка выкладання беларускай літаратуры: дапаможнік / І. М. Гоўзіч, А. І. Лугоўскі, С. А. Сычова. – Мінск : БДПУ, 2012. – 230 с.

2. Ляшук, В. Я. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбны дапаможнік / Л. В. Асташонак, Г. С. Гарадко, Г. М. Ішчанка і інш. ; пад рэд. В. Я. Ляшук. – Мінск : ТАА «Асар», 2002. – 416 с.

3. Рамзаева, Т. Г. Методика обучения русскому языку в начальных классах: учебное пособие для студентов пед. ин-тов по спец. № 2121 «Педагогика и методика нач. обучения» / Т. Г. Рамзаева, М. Р. Львов. – М. : Просвещение, 1979. — 431 с.

4. Шанько, А. П. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах : вучэбны дапаможнік для фак. педагогікі і методыкі пачатковага навучання пед. ін-таў / Я. М. Івашуціч, М. П. Лукашук, Б. В. Пятровіч, А. П. Шанько ; пад рэд. А. П. Шанько. – Мінск : Выш. шк., 1986. – 408 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ